Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/11 sprava 168

# [illegible]

НЕЗАЛЕЖНЫ ЧАСОПІС ПРАВАСЛАЎНАЕ МОЛАДЗІ

ПЕРШЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ №1

## У ГЭТЫМ НУМАРЫ

ПРАВАСЛАЎНЫЯ АЎТАРЫ
НАВІНЫ ЕПАРХІІ
АДРАДЖЭНЬНЕ ТРАДЫЦЫЙ
СЬПЕВЫ
СЬВЯТЫЯ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ
СЛОВА РЭДАКТАРА

...Вякі плывуць...
а Ён — раскрыжаваны...
жывы...
у крыжі цячэ цьвіком іржа...
і род людскі,
нячыстым апантаны,
ня мае сілы
зьняць Яго з крыжа...

# Праваслаўныя аўтары

## Зніч

У час апошняе высновы,
дзе Скоп глядз1ць на нас штодня,
няўжо ня ўслав1ць наша мова
Сьвятое Божае 1мя ?

У час сусьветнага садому,
што вар'яцее ад спакус,
блюзьнерыць тайна несьвядомы,
маўчыць сьвядомы беларус.

Я буду ў роспачы 1 ў скрусе,
пакуль ня спраўдз1ць гэты сьвет
саюз Царквы 1 Беларус1 —
праз нас,

Уладыка Ф1ларэт !

1983

...з россыпу слоў-крышталю,
прэтюдый 1 высновай,
промнем Хрыстовай хвал1
бл1сьне

Боскае

Слова...

# Уладзімір Караткевіч
## (зь дзёньніка)

18/IV-1982. Нядзеля.

Хрыстос уваскрос! У гэты б дзень сонцу — на ўсё неба, у адрозненне ад пахмурных кучак і каталіцкага вялікадня /я — патрыёт/, а тут лепей, чым у іх, але ўсё адно нічога асаблівага. Неба, праўда, упершыню па-сапраўднаму веснавое, дужа блакітнае, але шмат хмар і ўсяго чатыры градусы цеплыні. Акрамя таго, палякі абазвалі, сказалі, што сёння ў секты хрысціян праваслаўных вялікдзень. Усё жыццё жыву, а не ведаў, што я сектант. Прызнацца, праўдна, усе хрысціяне ў прынцыпе роўныя. Але я, зноў жа,як хрысціянін, ім дарую.

Усе адно на наш вялікдзень неба сінейшае.

# Навіны Епархіі

На сёньняшні дзень на псаломшчыкіх курсах пры Менскім Епархіяльным Упраўленьні займаюцца 60 чалавек.

На працягу года яны праслухаюць лекцыі па біблейскай гісторыі, вывучаць богаслужбовы статут, царкоўнаславянскую мову, музычную грамату й галасавыя сьпевы.

*

У 1988 годзе у краіне зарэгістравана звыш 8000 новых праваслаўных прыходаў. Зь йіх на Беларусі 30.

У тым жа годзе у рэспубліцы рукапакладзена 32 сьвятары ды 14 дзяканаў.

# АДРАДЖЭНЬНЕ ТРАДЫЦЫЙ
## ЯК ЗРАБІЦЬ ПІСАНКІ

Прапануем тэхніку васкаваньня.

Нам спатрэбіцца: воск /можна ў сьмесі з парафінам/, палачка, з убітым у яе канец маленькім цьвічком, яйкі, шалупіньне цыбулі.

Растопліваецца пчаліны воск, у яго мачаюць цьвічок так, каб на плешцы цьвічка была кропелька, якую і наносяць на зьлёгку падагрэтае яйка. Пасьля таго яйкі трэба вытрымаць або праварыць у адвары шалупіньня цыбулі /цыбульніку/. Не ператрымайце ў гарачым цыбульніку, бо зьлезе воск, і ўзор не будзе кантрасным.



Матывы дэкору пісанак:



## СЬПЕВЫ

Старажытная вялікая праваслаўная сьвятыня Беларусі — Цудатворная Жыровіцкая ікона Божай Мацеры шматстагодзьдзя ўслаўляецца народам. І зараз, на яе сьвята /7 траўня/, тысячы людзей едуць у Жыровіцкі манастыр. Раней людзі йшлі здалёк спэцыяльна пехатой, каб пакланіцца сваёй Заступніцы. На дарозе сьпявалі свае сьвятыя песьні. Простыя, з нескладанай мэлёдыяй, у якіх было ўсё — і думкі, і пачуцьці і просьбы. Такіх песень у наш час захавалася вельмі мала. І таму мы вельмі радыя давесьці да чытачоў тэкст народнай песьні

да Жыровіцкай Божай Мацеры. Калі яна склалася мы ня ведаем, але запісана яна ў час фашысцкай акупацыі на Ракаўшчыне /Менская вобласьць/ ад сьвятара Міхася Сеўбы. Яго ўжо няма, але запісанае засталося так, як сьпяваў ён з прыхажанамі, зьвяртаючыся ў цяжкія гады за дапамогай да вялікай Заступніцы нашага краю.




1. У Жыравіцах нам зьявілась, о, Марые,
   Бо нас грэшных палюбіла, Алілуйя!
   Прыпеў: Радасьць Вам, Херувімы,
   Сьпявайце Серафімы,
   Радуйся, радуйся, о, Марые.
2. Туды дзеці скот ганялі, о, Марые,
   Дзе цяпер сьвятыню славім, Алілуйя!
3. На грушковым стаяў дрэве, о, Марые,
   Абраз Прэсьвятыя Дзевы, Алілуйя!
4. І апорай праваслаўных,
   стаў Абраз твой Богам даны.
5. Няхай будзе Табе слава,
   што да нас ты завітала.
6. У Жыравіцы людзі ходзяць,
   там свае малітвы ўзносяць.
7. Мы Цябе ўсе велічаем,
   свае сьлёзы праліваем.
8. Ты нябесная нам Маці,
   да Цябе мы будзем звапі.
9. Няхай будзе Табе слава,
   што для нас Апорай стала.
10. Нашых ворагаў прагнала,
   беззаконных пакарала.
11. Каб жыла наша Краіна,
   адганяй ворагі злыя.

12. Хай заўсёды пакой будзе,
цябе просяць нашы людзі.

13. Бо нам помач Твае імя,
Жыровіцкая Сьвятыня.

14. Тое мейсца Ты абрала,
У нядолі ратавала.

15. Шмат стагоддзяў, як ізвесны,
Абраз Твой Сьвяты Нябесны.

16. Зблізка, здаля народ горнэ,
кланяюцца пакорна.

17. Ты, як маці, усіх прымаеш,
Чыстых сэрцам усіх знаеш.

18. Ты за іх Хрыста папросіш,
памілуй іх, Спасе, скажаш.

19 І за нас прасі ў Сына,
каб прасьціў нам грахі-віны.

20. Каб зьняў кары з нашай долі,
ацаліў нашы хваробы.

21. Тваю мілясьць нам даводзіць,
цудаў шмат было ў народзе.

22. Сьляпы, храмы і гарбаты,
вернецца здароў да хаты.

23. Беларусь Цябе ўся знае,
абаронцай называе.

24. Удава йдзе зь сьлязамі,
"Маці, зьмілуйся над намі".

25. Сіроты рукі ўзносяць,
Міласэрдзьдзя Твайго просяць

26. Усіх нас бачыш прад сабою,
прад сьвятой Тваёй іконай.

27. Людзі зблізку і здалёку,
йшлі, цярпелі холад, сьпёку

28. Да Прачыстыя Дзявіцы,
усе грэшнікі сьпяшыце.

29. Назад бесам апантаны,
да тваёй сьпяшыць іконы.

30. Толькі трэба Богу, брацьця
ўсім сэрцам спавядацца.

31. Як душу з грахоў ачысьціш,
радасьць светлую пачуеш.

32. Будзем жыці ўсім давольны,
зносіць свае гора здольны.

33. Кожны Цябе праслаўляе,
хто Тваю ікону знае.

34. На абраз Твой толькі гляне,
зараз яму лягчэй стане.

35. Ты да ўсіх нас ласку маеш,
і прад Богам заступаеш.

36. Вочы ўдзячныя ўздымаем,
і малітвай праслаўляем.

37. Ты сваім Пакровам крый нас,
пакуль жыем, барані нас.

38. А як будзем паміраці,
будзь пры нас, Сьвятая маці.

39. Дай нам Ангела Сьвятога,
каб нас увеў у аблічча Бога.

40. Каб у Райскую абіцель,
нас прыняў твой Сын-Збавіцель.

41. Каб і там, у Божай славе, о, Марые,
з Ангеламі мы сьпявалі, Аллілуйя.

# СЬВЯТЫЯ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

У гэтым нумары мы прапануем сьпіс Сьвятых Зямлі Беларускай.

1. Прэпадобнамучанік Афанасій, ігумэн Брэсцкі /+1648/
2. Прэпадобнамучанік Макарый, ігумэн Пінскі, Овруцкі, Каніўскі /+ 1678/
3. Прэпадобны Елісей Лаўрышэўскі /каля+1250/
4. Сьвяціцель Лаўрэнцій, біскуп Тураўскі /+ 1194/
5. Сьвяціцель Сімеон, біскуп Полацкі, біскуп Цьвярскі /+1289/
6. Благаверны вялікі князь Расьціслаў /Міхаэль/ Кіеўскі, Смаленскі / каля + 1167/ Заснаваў гарады: Расьціслаўль, Мсьціслаўль, Крычаў, Слаўгарад /дяпор/.
7. Блажэнная Сафія /Алелька/, княжна Слуцкая /+1612/. Астанкі яе знаходзяцца ў Менскім кафедральным Сьвята-Духавым Саборы.
8. Мучанік Гаўрыіл Беластоцкі, Слуцкі /+20 сакавіка 1690/. Астанкі яго у Сьвята-Пакроўскім Саборы у Гародні.
9. Сьвяціцель Кірыл, біскуп Тураўскі /+1183/
10. Прэпадобная Еўфрасіньня, ігуменьня Полацкая /+1173/. Астанкі яе у Спаса-Прэабражэнскай царкве г. Полацка.
11. Сьвяціцель Міна, біскуп Полацкі /+1116/
12. Блажэнны Марцін Тураўскі /+1150/
13. Сьвяціцель Дзіянісій, біскуп Полацкі /+1182/
14. Сьвятая Іўліанія, княжна Альшанская /каля +1540/

## А Д   Н А Ш Ы Х   К А Р Э С П А Н Д Э Н Т А Ў

Як вядома, зноў адкрываецца Беларуская духоўная семінарыя пры Жыровіцкім манастыры. Нам паведамілі, што Уладыка Філарэт мусіць адкрыць першы курс ужо ў гэтым годзе. Рэдакцыя прапануе жадаючым вучыцца зьвяртацца да сьвятароў по месцу жыхарства, каб ужо пачаць падрыхтоўку да іспытаў.

У Полацку зноў будзе Існаваць жаночы манастыр Сьвятой ЕфрасІньІ Полацкай.

---

Пастановай дырэктара Грамадска-АдмІнІстрацыйнага аддзела ад 3 сакавІка 1989 года ў Рэестр аб'яднаньняў І саюзаў Ваяводскай управы ў Беластоку (Польшча) упІсана аб'яднаньне пад назвай Праваслаўнае брацтва.

СядзІба брацтва знаходзІцца ў Беластоку. Яно ставІць сабе мэту замацоўваньня І захоўваньня тоеснасьцІ І яднаньня праваслаўнага насельнІцтва.

## СЛОВА РЭДАКТАРА

Нам паведамІлІ, што ў ХоцІмску людзІ зьбІраюць подпІсы пад лІстом з патрабаваньнем вярнуць праваслаўны сабор. Сёньня мясцовая парафІя тулІцца ў былой могІлкавай каплІцы, І ў царкоўныя сьвята ўсе жадаючыя ня могуць памясьцІцца ў царкве. Па-ранейшаму, людзей, падпІсаўшых лІст, чакаюць непрыемнасьцІ, зь ІмІ "размаўляюць" па месцу працы, сваякоў-камунІстаў выклІкаюць у парткамы. Няма чаму дзівІцца! Да Масквы далёка...

Погляд рэдакцыІ: кожны беларус павІнен заняць прынцыповую пазІцыю ў справе вяртаньня народу яго храмаў - І праваслаўных, І каталІцкІх, І пратэстантскІх І яўрэйскІх І г.д.

ПАМАЖЫ ВАМ СПАДАР!

Знадыходзячым Сьвятым ВялІкаднём!

СтрацІлат.

---

ЧасопІс не з'яўляецца органам афІцыйных царкоўных уладаў І адлюстроўвае думку незалежнае рэдакцыІ.

Бясплатна. Нумар выдадзены коштам рэдактара.
Наклад 10 000 асобнІкаў.
Ахвяруйце грошы ў фонд выданьня!

РЭДКАЛЕГІЯ.